## ШЧАСЛІВАГА РАЗВІТАННЯ!

Час няспынны... Яго хуткацечнасць чалавеку непадуладна. І ў адмераных нам лёсам дзесяцігоддзях жыцця пяцігадовы адрэзак здаецца зусім нязначнай часцінкай. Але гэта толькі ў матэматычным вымярэнні, у жыцці ж нашым кожны дзень, нават хвіліна нясуць на сабе адбітак важнасці, значнасці.

Вось і для сёлетніх выпускнікоў нашага універсітэта пяць студэнцкіх гадоў прамільгнулі як птушкі. Але які гэта быў час! Станаўленне асобы, ўзбагачэння сябе ведамі, набыцця прафесіі, аб якой марылі. Мэта дасягнута, запаветны дыплом вось-вось будзе ўручаны, але ў сэрцах выпускнікоў — лёгкі сум: закончыліся цікавыя і бесклапотныя, у параўнанні з тым жыццём, якое іх чакае наперадзе, гады. За парогам Гомельскага дзяржуніверсітэта — жыццё са шматлікімі складанасцямі, выклікаными няпростай палітычнай і эканамічнай сітуацыяй у нашай рэспубліцы, у краінах былога Саюза. Пераход да рынку нарадзіў нялёгкую для нашага грамадства праблему — беспрацоўе. На жаль, трапілі ў лік тых, хто пакуль не атрымаў гарантыі на працаўладкаванне, і выпускнікі некаторых спецыяльнасцей ГДУ. Можна зразумець іх трывогу за свой лёс. Але надзея на лепшае, аптымізм усе ж не павінны пакідаць іх. Складана будзе таксама і тым маладым спецыялістам, якія работу атрымалі, але ва ўмовах канкурэнцыі ім трэба будзе ўтрымацца на «плыву», не страціць працоўнага месца. А для гэтага спатрэбяцца і набытыя ўжо веды, і пастаяннае іх удасканаленне, папаўненне новымі, якія адпавядаюць сённяшняму часу.

І ўсё ж, нягледзячы на ўсе гэтыя праблемы, рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта жадаюць вам, дарагія выпускнікі, як мага менш цяжкасцей і перашкод у вашым самастойным працоўным жыцці.


# Гомельскі ўніверсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

| № 14 (836) | Аўторак, 23 чэрвеня 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 10 кап. |
|---|---|---|---|---|


## ЯКІМ БУДЗЕ ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА

Як бы не зніжаўся ў апошнія гады прэстыж студэнцкіх будаўнічых атрадаў, сярод моладзі ўсё ж знаходзяцца ахвотнікі, жадаючыя паехаць папрацаваць на летнія канікулы, падзарабіць грошай. І ўсё цяпер праходзіць больш будзённа і празаічна, без гучных заклікаў да студэнтаў выканаць свой пачэсны абавязак, без напышлівых фраз і лозунгаў.

Звыш трохсот студэнтаў нашага універсітэта ў складзе васьмі атрадаў прымуць сёлета ўдзел у трэцім працоўным семестры. Яны жывуць апошнімі прыгатаваннямі да выезду на месцы дыслакацыі. А ў пачатку чэрвеня 30 студэнтаў ужо адправіліся ў Краснадарскі край, дзе прыступілі да працы.

Гэтым летам універсітэцкія атрады будуць сканцэнтраваны ў паўднёвых рэгіёнах былога Саюза — у Крыме (Сімферопальскі раён), Стаўрапольскім і Краснадарскім краях. Яны будуць заняты на праполцы, уборцы гародніны і фруктаў, іх перапрацоўцы на кансервавых заводах. Сёлета выездаў байцоў на будаўнічыя аб'екты вобласці, нашай рэспублікі не прадугледжваецца.

Цудоўныя па свайму клімату, шчодрыя на ласкавае сонца і вітамінныя ўраджаі мясціны чакаюць на летнія месяцы маладых, працавітых рук. І будзем спадзявацца: нашы студэнты акажуць паўднёвым гаспадаркам адчувальную дапамогу, што, у сваю чаргу, акупіцца для іх матэрыяльна. А па заключанаму дагавору паміж штабам працоўных спраў ГДУ з Гомельскім аб'яднаннем працоўных калектываў студэнтаў і моладзі па заканчэнню работы для работнікаў і студэнтаў універсітэта будзе арганізавана дастаўка і продаж гародніны і фруктаў, сабраных байцамі ГДУ.

**Наш кар.**





## ДА ДЫПЛОМАЎ АПОШНІ КРОК

Цяпер кожную раніцу вучэбныя карпусы універсітэта нагадваюць патрывожаны вулей. Каля многіх вучэбных аўдыторый і кабінетаў — групы ўсхваляваных студэнтаў, а за дзвярыма, дзе працуюць экзаменацыйныя камісіі, выкладчыкі — строгая і рабочая абстаноўка. Малюнак знаёмы, бо ідуць летняя экзаменацыйная сесія і абарона дыпломных работ.

Для выпускнікоў — гэта заключны этап вучобы ва універсітэце і, канешне, самы адказны. На сталах — шматлікія букеты кветак, якія надаюць гэтай падзеі асаблівую ўрачыстасць. Без пяці мінут маладыя спецыялісты трымаюць своеасаблівую справаздачу на сваю прафесіянальную годнасць перад выкладчыкамі, якія давалі ім веды ўсе гэтыя пяць гадоў. І цяпер, перад хуткім развітаннем з факультэтам, універсітэтам у фізікаў і біёлагаў, эканамістаў і філолагаў, матэматыкаў і гісторыкаў адно пачуццё — удзячнасці выкладчыкам, на якіх хаця часам і крыўдзіліся за іх строгасць і патрабавальнасць, за набытую прафесію.

**НА ЗДЫМКАХ: на «выдатна» абараніла дыпломную работу выпускніца фізічнага факультэта спецыялізацыі «Радыёфізіка» Ірына Лявоцкая.**

Фота **У. Чысціка.**

*У прафкоме*

## ТЭХНІКА БЯСПЕКІ— У НЕБЯСПЕЦЫ

Няхай даруюць чытачы за такі слоўны каламбур, але справы з захаваннем правілаў па тэхніцы бяспекі ва універсітэце абстаяць вельмі дрэнна. Члены прафкома заслухалі інфармацыю інжынера па ТБ і ахове працы М. С. Гамалаева аб той рабоце, якая праводзіцца ў гэтым напрамку ў структурных падраздзяленнях ГДУ, і прыйшлі да вываду, што карціна, мякка кажучы, сумная.

У лабараторыях факультэтаў, дзе выкарыстоўваюць хімрэактывы, іншыя небяспечныя матэрыялы, вельмі часта не захоўваюцца правілы па тэхніцы бяспекі, а дэканы, загадчыкі кафедр, іншыя кіраўнікі адносяцца да гэтага фармальна, не ўдзяляюць належнай сур'ёзнай увагі фактам парушэнняў. І нават пасля аб'яўлення ім за гэта строгіх вымоў становішча ў лепшы бок не мяняецца. У любы момант могуць здарыцца няшчасныя выпадкі са студэнтамі, якія працуюць на вылічальных машынах на эканомфаку, бо электрычныя разеткі знаходзяцца амаль у аварыйным стане. У многіх аўдыторыях вучэбных карпусоў ледзь трымаецца ў рамах аконнае шкло, што пры заклейванні вокнаў, іх мыцці студэнтамі таксама можа выклікаць небяспечныя сітуацыі. У многіх лабараторыях слаба ці наогул не працуе выцяжная вентыляцыя, адсутнічае цэнтралізаванае забеспячэнне вучэбных карпусоў медыцынскімі аптэчкамі, што ў выпадку траўм можа мець больш сур'ёзныя вынікі. Не арганізоўваюцца, як гэта было ў ранейшыя гады, медыцынскія агляды студэнтаў і выкладчыкаў, якія працуюць у шкодных умовах. Членам прафкома не аднойчы самім даводзілася быць сведкамі абыякавых адносін некаторых работнікаў АГЧ, ад якіх залежаць нармальныя ўмовы працы ва універсітэце, да сваіх службовых абавязкаў. Усе гэта — вынік адсутнасці строгага кантролю, належнай патрабавальнасці з боку інжынера па ТБ М. С. Гамалеева. Не ўдзяляе гэтым пытанням патрэбнай увагі і адміністрацыя універсітэта.

Прафком прызнаў работу па ТБ нездавальняючай, запатрабаваў ад М. С. Гамалеева наладзіць яе так, каб працаваць і вучыцца ва універсітэце можна было без шкоды для здароўя.

*Канферэнцыі*

## ВАЛАДАРУ РОДНАГА СЛОВА

110-й гадавіне з дня нараджэння народнага песняра Беларусі Янкі Купалы была прысвечана рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя, якая адбылася ў нашым універсітэце. З дакладамі і паведамленнямі на канферэнцыі выступілі навукоўцы з Гомеля, Мазыра, Брэста, Магілёва.

Уступнае слова меў рэктар ГДУ член-карэспандэнт АН Рэспублікі Беларусь Л. А. Шамяткоў. На пленарным пасяджэнні пра ролю Янкі Купалы ў развіцці нацыянальнай мовы і літаратуры гаварылі прафесар У. В. Анічэнка, доктар філалагічных навук Р. М. Казлова, загадчыца кафедры беларускай літаратуры Мазырскага педагагічнага інстытута Л. В. Мельнікава, дацэнт кафедры методыкі і педагогікі пачатковага навучання Л. А. Піскун, дэкан факультэта методыкі і педагогікі пачатковага навучання В. В. Шур з Мазырскага педінстытута.

Пасля пленарнага пасяджэння канферэнцыя працягвала секцыйную работу. Пра асаблівасці мовы купалавых твораў распавядалі А. П. Ціток з Брэсцкага педінстытута, У. Д. Кніга з Мазырскага педінстытута, А. А. Станкевіч, У. А. Бобрык з нашага універсітэта і іншыя.

Правядзенне навуковай канферэнцыі на базе ГДУ мае свае адметнасці. Тут на кафедры беларускай мовы створаны «Слоўнік мовы Янкі Купалы», выданне якога стане значным укладам у развіццё беларускай філалагічнай навукі.

**Л. КУЗЬМІЧ,**
**выкладчык кафедры беларускай мовы.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, калектыў кафедры беларускай літаратуры горача віншуюць асістэнта ЯЦУХНУ Віктара Іванавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**



# АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ЧАС

**На гэтым тыдні пасля апошняга экзамена выпускнікі развітаюцца са сваімі роднымі школамі. Натуральна, пераважная большасць учарашніх школьнікаў марыць прадоўжыць вучобу, набыць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, рабочую прафесію. Наперадзе іх чакае новае выпрабаванне на трываласць набытых ведаў.**

Сёлета, як і ў папярэднія гады, чакаецца шмат абітурыентаў у нашым універсітэце. Аднак для асобных з іх усе турботы і хваляванні ўжо засталіся ззаду. Размова ідзе аб здаўшых датэрмінова ўступныя экзамены.

Спачатку скажам аб упершыню праведзеным ва універсітэце злёце пераможцаў абласных алімпіяд, якія вырашылі паступаць у ГДУ. З імі было праведзена субяседаванне і ў экзаменацыйныя лісты выстаўлены вышэйшыя балы. Для тых, хто скончыць сярэднюю школу з залатым або сярэбраным медалём, гэта стала першым і апошнім выпрабаваннем.

З кожным годам усё большы размах набывае падрыхтоўка спецыялістаў па індывідуальных дагаворах. Вялікая колькасць юнакоў і дзяўчат паглыбляла свае веды на вячэрніх падрыхтоўчых курсах. Як першыя, так і другія, хто ў канцы вучобы паспяхова справіўся з кантрольнымі заданнямі і атрымаў адпаведную рэкамендацыю дэкаката давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, здавалі ўступныя экзамены датэрмінова. Яны праводзіліся ва універсітэце з 25 па 30 мая. Найбольшая колькасць здаўшых іх аказалася на спецыяльнасці «Бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці», «Правазнаўства». Неабходна адзначыць, што некаторыя абітурыенты паспяхова справіліся з пісьмовымі работамі і вуснымі экзаменамі, набралі па 9—10 балаў і ўжо могуць адчуваць сябе спакойна, бо маюць рэальны шанц стаць першакурснікамі. Ну а тыя, хто «праваліўся» або атрымаў здавальняючыя адзнакі, маюць магчымасць паправіць становішча з другой спробы — у час асноўных уступных экзаменаў.

Адначасова з выпускнымі праводзіліся і ўступныя экзамены ў наш універсітэт на базе Буда-Кашалёўскай вочна-завочнай школы і гомельскай СШ № 56 — базавай нашага універсітэта.

У дні датэрміновай здачы уступных экзаменаў у ГДУ іх трымала каля 500 чалавек.





НА ЗДЫМКАХ:
Абітурыенты датэрмінова здаюць пісьмовы экзамен па роднай мове і літаратуры.
Цяжкая задача.
Як не парадавацца, калі атрымаў добрую адзнаку?
Фота У. Чысціка.

# НА РАЗДАРОЖЖЫ

**Н**АБЛІЖАЕЦЦА дзень, калі выпускнікі ГДУ атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі. Падзея гэта, безумоўна, у іх жыцці неардынарная. З аднаго боку, у іх душы радасць, што дайшлі ўсё ж да фінішу (а некаторыя аднакурснікі выпрабаванне ведамі не вытрымалі, аказаліся за сценамі універсітэта), атрымалі спецыяльнасць, аб якой марылі. А з другога... Не ва ўсіх, на жаль, ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні. Жорсткія ўмовы рынку выбілі глебу з-пад ног, запаветны дыплом сёння ўжо не гарантуе працоўнага месца, і можна прама са студэнцкай аўдыторыі папоўніць армію беспрацоўных нашай рэспублікі. Так, вядома, што сярод 15 тыс. чалавек, якія зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных Беларускім цэнтрам занятасці, самую шматлікую групу складаюць выпускнікі ВНУ.

Грознае дыханне рынку адчулі на сабе пяцікурснікі нашага універсітэта. Не атрымалі накіраванняў на работу ў час сёлетняга размеркавання 26 выпускнікоў эканамічнага, фізічнага і матэматычнага факультэтаў. У самым крытычным становішчы апынуліся выпускнікі, якія атрымалі спецыяльнасці «Эканоміка і сацыялогія працы», «Эканамічная інфарматыка і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання». Так, з 56 чалавек, што набылі першую з названых спецыяльнасцей, канкрэтныя месцы прызначання на працу атрымалі толькі 11 юнакоў і дзяўчат, 13 — узялі «свабодныя» дыпломы ў адпаведнасці з п. 15—19 Палажэння аб размеркаванні, а 16 самі вымушаны былі шукаць самастойна будучыя месцы працы. Такая ж колькасць — 16, як кажуць, «павісла ў паветры». Пакуль падзецца ім няма куды. Не намнога лепш абстаяць справы і ў выпускнікоў спецыяльнасці ЭІ і АСК. Тут пакуль не знайшлося месц для будучай працы чатыром выпускнікам, 12 атрымалі свабодныя дыпломы, чатыры— пасля доўгіх пошукаў работу сабе знайшлі.

Не было куды размяркоўваць таксама выпускнікоў вытворчага патоку матфака. Усяго іх сёлета было падрыхтавана 21 чалавек. І толькі двое з іх атрымалі канкрэтныя месцы прызначэння па заяўках міністэрстваў і ведамстваў. Астатнія былі аддадзены пад уладу лёсу — хто сам сабе што адшукаў, а чатыры пакуль у ліку беспрацоўных. У фізікаў вытворчага патоку таксама засталіся нешчаслівымі два маладыя спецыялісты: работы для іх няма.

Як выйсці са складанага становішча сённяшнім маладым спецыялістам і як не дапусціць таго, каб апынуліся ў ім будучыя выпускнікі ГДУ? У нейкай ступені адказ на хвалюючыя пытанні, на нашу думку, можна знайсці ў ніжэйзмешчаным матэрыяле.

# СТУДЭНЦКАЯ БІРЖА ПРАЦЫ

**Ва ўмовах пераходу да рынку ў выпускнікоў ВНУ не было цвёрдага (дзяржаўнага) размеркавання. У гэтай сувязі многія студэнты, якія закончылі навучанне, сутыкнуцца з сур'ёзнай праблемай працаўладкавання. А практыка апошніх гадоў паказвае, што выпускнікі ВНУ са «свабодным» дыпломам уладкоўваюцца на работу самастойна месяцамі. У пошуках працы па спецыяльнасці ім аказвалі пасільную дапамогу былыя бюро па працаўладкаванню і інфармацыі насельніцтва.**

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь аб занятасці насельніцтва ўказаныя органы па працы пераўтвораны ў дзяржаўныя службы занятасці (або як іх у народзе называюць біржы працы). На іх цяпер, адначасова з працаўладкаваннем, накладаюцца дадатковыя функцыі перападрыхтоўкі незанятага насельніцтва і выплаты дапамогі па беспрацоўю. Улічваючы, што гэтыя службы пакуль недастаткова развітыя, маламікія і не забяспечаны ў дастатковай ступені сучаснымі сродкамі вылічальнай тэхнікі і сувязі, разлічваць на неабходную аператыўную з іх боку дапамогу ў працаўладкаванні маладых спецыялістаў не даводзіцца.

Трэба таксама мець на ўвазе, што рыначныя адносіны мяняюць патрабаванні да кадраў, іх кваліфікацыі і асабістых якасцей. Што датычыцца спецыялістаў, то прадпрыемствам ужо сёння патрэбны дзелавыя, ініцыятыўныя, эканамічна граматныя работнікі, якія ўмеюць карыстацца сучаснымі сродкамі камп'ютэрнай тэхнікі. (Адносна эканамістаў трэба сказаць, што тут асабліва цэняцца высокі прафесіяналізм і шырыня падыходу да вызначэння крыніц эканамічнага поспеху).

У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце распрацавана мадэль спецыяліста для работы ва ўмовах рынку (шматступенчатая сістэма). Канешне, рынак працы паступова прымусіць большасць студэнтаў раней або пазней змяніць свае працоўныя паводзіны, запатрабуе інакш адносіцца да адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі. Але для грамадства было б больш карысна, каб гэта адбывалася як мага раней.

У заканадаўстве аб занятасці насельніцтва прадугледжваецца, што моладзь на рынку працы будзе ў нейкай ступені абаронена агульнымі і асаблівымі гарантыямі, як напрыклад:

— прадастаўленне падыходзячай працы на перыяд не менш трох гадоў выпускнікам дзяржаўных навучальных устаноў;

— стварэнне дадатковых працоўных месц для моладзі, распрацоўка спецыяльных праграм для іх навучання;

— устанаўленне Саветамі народных дэпутатаў на прадпрыемствах, размешчаных у рэгіёне, азначанай квоты працоўных месц для прыёму моладзі і іншыя льготы.

Аднак фарміраванне канкрэтных механізмаў, нарміраваных актаў па рэалізацыі палітыкі ў цяперашні час яшчэ не завершана.

Адсюль узнікае пытанне: як абараніць моладзь на рынку працы, як павысіць яе канкурэнтназдольнасць?

На нашу думку, адным з такіх шляхоў з'яўляецца дэцэнтралізацыя падрыхтоўкі кадраў з тым, каб кожная тэрыторыя (прымяняльна да Рэспублікі Беларусь — кожная вобласць) магла б вырашаць праблемы занятасці моладзі і задавальняць рэгіянальныя патрэбы ў кваліфікаваных кадрах.

Неабходна таксама далейшае пашырэнне дагаворных форм падрыхтоўкі спецыялістаў паміж прадпрыемствамі (розных форм уласнасці), навучальнымі ўстановамі і навучэнцамі, а таксама заключэнне працоўных пагадненняў на кантрактнай падставе паміж маладымі спецыялістамі і прадпрымальнікамі. Аб мэтазгоднасці пераходу да шматступенчатай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў ужо гаварылася раней.

А што ж можна зрабіць у сувязі з гэтым ужо ў бліжэйшы час?

Эканамічная нестабільнасць, рост беспрацоўя ў рэспубліцы выклікае неабходнасць стварэння (з удзелам Рэспубліканскага цэнтра занятасці) міжвузаўскай студэнцкай біржы працы (напрыклад, на базе БДЭУ). Асноўная яе задача — аказанне дапамогі выпускнікам у працаўладкаванні, наладжванні сувязей з будучымі работадаўцамі.

Біржа можа таксама выконваць і функцыі арганізатара «другаснай» занятасці студэнтаў. Яна дапаможа ім зарабляць у вольны ад вучобы час сродкі, не дапускаючы пры гэтым, каб студэнты ў цяперашняй жорсткай эканамічнай абстаноўцы дзеля заробку працавалі ў любых умовах (маецца на ўвазе сацыяльная абарона працуючых студэнтаў).

Стварэнне студэнцкай біржы працы дазволіць істотна пашырыць дзейнасць дзяржаўнай службы занятасці, больш дыферэнцыравана вырашаць праблемы працаўладкавання выпускнікоў і іх сацыяльнай абароны ва ўмовах канкурэнцыі.

**У. АРЭШЧАНКА,**
**прафесар кафедры эканомікі прадпрыемстваў БДЭУ.**



У ЗЕЛЯНІНЕ ПАТАНАЮЦЬ КАРПУСЫ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА.

Фота У. Чысціка.

# МАРШРУТЫ ВАШЫХ ПАДАРОЖЖАЎ

Лета — заўсёды доўгачаканая і жаданая пара для студэнтаў: канікулы! Яны могуць адпачыць, падлячыцца па пуцёўках, набытых у прафкоме студэнтаў універсітэта.

**ЛЯЧЭБНЫЯ:**

Сан. «Эльбрус» (г. Нальчык), жнівень — захворванні нярвовай і сардэчна-сасудзістай сістэм (6 шт). Кошт — 6986 руб.

Сан. імя Тэльмана (г. Жалезнаводск) — з 4.08 — захворванні мочапалавой сістэмы. Кошт — 9291 руб.

Сан. імя Леніна (г. Бабруйск) — з 13.08 — захворванні органаў стрававання.

Курсоўка Жалезнаводск — захворванні органаў стрававання — з 4.08. Кошт — 2200 руб.

**ТУРЫСТЫЧНЫЯ:**

Пансіянат адпачынку Коблева (Адэса) — з 19.07; 12.08 — 3 шт.

П/а «Паўднёвы» (г. Адэса) — з 26.08 — (8 шт.).

П/а «Нябуг» (г. Туапсе) — з 29.07.

Турбаза Цiберда — з 10.07 — (20 шт.).

Т/б Севастопаль — з 11.07 — (5 шт.).

Т/б Сяргееўка (г. Адэса)— з 13.07.

База адпачынку Учкуеўка (Севастопаль) — з 20.08 — (2 шт.).

Дом адпачынку «Нарач» — з 20.08.

Кошт турыстычных пуцёвак — ад 2-х да 6-ці тысяч рублёў.

**СЯМЕЙНЫЯ:**

П/а Коблева (г. Адэса) — на сям'ю з 2-х чал. — з 12.08.

Пансіянат з лячэннем «Кастрычнік» (Нальчык) (на сям'ю з 2-х чал.) — 7 шт.

П/а «Паўднёвы» (г. Адэса), (на сям'ю з 2-х чал.) — з 22.07.

П/а «Гізель-Дэрэ» (г. Туапсе). (на сям'ю з 2-х чал.) — з 22.07, 25.08 — 11 шт.

П/а «Сасновы гай» (г. Геленджык), (на сям'ю з 2-х чал.) — з 13.07, з 6.09 — 4 шт.

П/а «Цыня» (г. Юрмала), (на сям'ю з 2-х чал.) — з 27.06 — 2 шт.

П/а «Кастрычнік» (г. Адэса), (на сям'ю з 2-х чал.) — з 5.08.

П/а «Нарачанка» (г. Мінск), (на сям'ю з 2-х чал. — 4 шт.), (на сям'ю з 3-х чал. — 4 шт.) — з 6.08.

Студэнты аплачваюць 10% кошту пуцёўкі.

За даведкамі звяртацца ў прафком студэнтаў па тэл. 57-16-11.

Наступны нумар газеты выйдзе за 1 верасня.

*У рэдакцыйнай пошце—паэзія*

**Иван ХАРЛАМОВ.**

Помнишь,
В Петропавловском соборе
Ты свечу
Поставила Христу?
Я ж смотрел
Едва ли не с укором
На твою
Святую простоту.
Неужели
Ты и вправду веришь,
Что,
Ему лишь подношенье
дай, —
Он тебе,
Спеша, откроет двери
И в земной,
И в поднебесный рай?
Люди убеждались
Не однажды:
Как, молясь,
Христа ни ублажай,
Только чистотой душевной
Каждый
Сам врата
Распахивает в рай.

* * *

Предвечерье.
Тихо дремлет нива.
Льется свет
Малиновой зари.
Бормоча
Задиристо-ревниво,
За селом токуют глухари.
Из-за леса
В звездном половодье,
Не спеша,
Плывет луны челнок.
Огненными всплесками
Уходят
Метеоры,
Отслужив свой срок.
Филин
Вдруг заплачет одиноко.
Совы пролетают,
Как во сне...
И плутает
Где-то недалеко
Грусть моя
На вороном коне.

* * *

Идя по жизни —
Праздной и непраздной, —
Мы сердцу
Поверяем свой маршрут.
И, не спросясь,
Могучие соблазны
Направо и налево
Нас влекут...
Есть женщины,
Чью чувственность,
Как пламень,
Нам выдержать
При встречах не дано...
И зачастую
Скользкими путями,
Разгорячив,
Уводит нас вино.
Как в колдовстве,
Мы, возгордясь, играем
В мишурность мод
И ресторанный блеск...
И так ли непослушны
Мы бываем,
Когда, хитря,
К картишкам тянет бес?
И, не противясь
Силе нетерпенья,
Ой, как мы все
Бываем хороши!..
И все ж во мне
Главенствуют не тени,
А сказочная солнечность
Души!

## О ЛЮБВИ

**Сергей МОРОЗ,**
**слушатель подготовительного отделения ГГУ.**

Короткой, полноводной как река,
Взаимной, лунной,
но не безразмерной.
Была ты ношей тяжкой, хоть легка,
А стала непутевой и неверной.
Устал, но отыскать хочу твой путь,
И в нашей жизни тоже есть
размеренность,
Но даже, если счастья не вернуть,
Мне не забыть, что есть
на свете верность.
Не тем огнем горят мои глаза,
Не то ищу, что потерял не знаю.
И только на твоей щеке слеза,
Которую неспешно вытираю.

* * *

Ушедшую любовь не возвращайте,
Коль уберечь ее вы не смогли.
Любимая, простите и прощайте,
Не дал я Вам ни неба, ни земли.
Зову я Вас на «Вы» с моею болью,
Спасибо Вам, что можете понять.
Позвольте прошлое мне
называть любовью,
И неудачником хочу себя назвать.
Приворожить тебя я не сумею,
А униженья просто не снесу,
Хоть больно мне, поверь,
я не жалею,
И тяжкий крест судьбы своей несу.
Быть может просто крылья
обломались,
Веселья дни и радости ушли.
Была любовь, но в ней мы
потерялись,
А после в ней друг друга не нашли.

* * *

## В МИНУТЫ ГРУСТИ

Я к пропасти иду за шагом шаг,
Люблю тебя, но счастлив лишь
в разлуке.
Не стал тебе я другом,
но не враг,
О, Господи, как щедр ты на муки.
Как дальше жить, когда в душе
стекло?
Оно то бьётся, то по сердцу
режет...
Ищу, руки твоей ловлю тепло,
А ощущаю ядовитый скрежет.
Совсем не по тебе моя печаль,
Я боль стерплю, хоть не было
утраты.
Смотрю за синь тумана;
просто вдаль,
Не состраданий жду, а мести
и расплаты.

*ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК*

# ЭХ, ЖЫЦЦЁ!..

Раніца ў інтэрнаце. На ложках ляжаць пяць студэнтаў з розных курсаў.

**Першакурснік:** — Падымайцеся, рабяты, час ісці на лекцыі.

**Другакурснік:** — Ды што ты! Давайце адаспімся, вучыцца трэба толькі перад сесіяй...

**Трэцякурснік:** — Эй, мужыкі, на лекцыі не ідзем, пайшлі піўка пап'ём.

**Чацвёртакурснік:** — Навошта піва? Лепш давайце гарэлачкі цяпнем.

**Пяцікурснік:** — Мужыкі, ну што вы спрачаецеся. Кінем манету. Рэшка выпадзе — ідзем піць піва, арол — гарэлку, на рабро стане — спім, а калі ў паветры завісне — ідзем на заняткі...

* * *

Студэнта пытаюць, як ён умудраецца жыць на адну стыпендыю?

— Вельмі проста. — Першы тыдзень жыву па правілу правай рукі.

— Гэта як?

— Прыходжу ў сталовую, правай рукой закрываю цэны і выбіраю, што душа пажадае.

— А другі тыдзень?

— Другі тыдзень — па правілу левай рукі. Прыходжу ў сталовую, левай рукой закрываю блюда, гляджу на кошт і выбіраю.

— А астатнія?

— А астатнія два тыдні жыву па правілу бураўчыка. Прыйду ў сталовую, пакручуся, пакручуся і іду назад.

* * *

За час вучобы ў студэнта Круцікава памерлі восем бабуль і шэсць дзядуль, цяжка хварэлі 29 родных малодшых братоў, 17 разоў выходзіла замуж адзіная сястра. Старэйшы брат уходзіў у армію 11 разоў і 9 разоў вяртаўся адтуль, што пацвярджаецца адпаведнымі даведкамі.

* * *

Студэнт прыйшоў на экзамен дрэнна падрыхтаваны. Прафесар аддаў студэнту залікоўку са словамі:

— У вас не мозг, а пустыня.

Студэнт узяў залікоўку, схаваў яе ў кішэню і не ўходзіць.

— Што ў вас яшчэ? — спытаў прафесар.

— У мяне ёсць заўвага.

— Якая яшчэ заўвага? — здзівіўся прафесар.

— У кожнай пустыні ёсць аазіс, але не кожны вярблюд можа яго знайсці.

# МУДРЫЯ ДУМКІ

Чтобы жить честно, надо рваться, путаться, биться, ошибаться, начинать и бросать, бросать и начинать, и вечно бороться и лишаться. А спокойствие — это душевная подлость.

**Л. Толстой.**

Когда вы делаете добро другим, вы, в первую очередь, приносите добро самому себе.

Будьте самим собой, т. к. зависть есть невежество, а подражание — самоубийство.

Мудрец, желая быть над людьми, становится ниже их, желая быть впереди, становится сзади них.

**Д. Карнеги.**

Человека хорошего, благожелательного и искреннего можно узнать по его глазам.

**М. Аврелий.**

Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў фізічнага факультэта смуткуе ў сувязі са смерцю студэнта I курса Сяргея РАДКАЎЦА і выказвае глыбокае спачуванне сям'і і блізкім памёршага.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.

Спонсар газеты — райсавет народных дэпутатаў Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

Гомельская фабрыка «Палесдрук» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь г. Гомель, Савецкая, 1.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 432.

Падпісана да друку ў 15.00.